За цябе, Беларусь!

ГАСПАДАР НЕБА

РОЎНАЕ зялёнае поле сцелецца да самага гарызонту. Вецер варушыць нізкарослую траву.

Халадок надыходзячага вечара апускаецца на поле. Іван Камінскі — гвардыі капітан, камандзір карабля — з яўным задавальненнем аглядае сваіх «сынкоў» і гаворыць:

— Добра. Добра, хлопцы. За справу!

Гэта было ў жнівеньскі вечар на Рускай раўніне перад далёкім і складаным палётам у тыл ворага. Баявыя сябры, верныя таварышы штурман пскаўчанін Аляксандр Іваноў і стралок-радыст з Мурманска Саша Ашын уважліва ўслухоўваліся ў кожнае слова камандзіра. Праз некалькі мінут грозны карабель ляжа на баявы курс. Пройдзе крыху часу — і пад крыллямі самалёта паплыве родная беларуская зямля. Экіпаж ведае сваю задачу і ведае перашкоды, што стаяць на шляху. Лівень смерці звергне ён на галовы немцаў. Агонь будзе палаць унізе, вынішчаючы ірадава племя, якое спустошае Беларусь. «Гэта за Віцебск!» — скажа Камінскі. «Гэта за Пскоў!» — падумае Іваноў. Стоячы на прыступцы, Іван Камінскі нейкае імгненне затрымліваецца.

— Вецер з Беларусі, хлопцы. Чуеце? — і, не чакаючы адказу, імклівым рыўком саскоквае ў кабіну.

Шалёна гудуць прапелеры, сцелецца ўпарадзе зялёнае поле, падбадзёрліва ўсміхаецца камандзір палка гвардыі падпалкоўнік Родзін. Узмах рукі — і магутная птушка, паслухмяная волі Камінскага, імкліва бяжыць па зялёнай сцежцы, набіраючы скорасць. Яшчэ імгненне — і зямля застаецца ўнізе, а ўпарадзе — прывабная прастора і трывожны, ласкавы вецер з Беларусі.

РОЎНА ГОД назад, у жнівеньскі дзень, выйшаў Іван Камінскі на аэрадром і спыніўся ля самалёта. Доўга стаяў ён ля машыны, затым улез у кабіну, папоркаўся ля шчыта прыбораў, узабраўся на крыллі, сеў, падкурчыў пад сябе ногі і ўсміхнуўся тэхнікам, якія пазіралі на новага пілота.

— Шустры конь, — прамовіў Камінскі, саскочыўшы з крыла. Лётчык пайшоў полем уздоўж унушальнага раду машын, напяваючы любімую песню. Цёплы вецер падхапіў яе, і яшчэ доўга гучэлі ў густым вячэрнім паветры словы аб тым, каб вецер паляцеў на Беларусь, дзе засталася каханая дзяўчына, і расказаў ёй аб блізкай сустрэчы.

У гэты вечар Іван Камінскі набыў вялікую, непарушную веру ў вяртанне, у перамогу. Ён прама з аэрадрома прышоў на партыйны сход. Вакол сядзелі незнаёмыя яшчэ пілоты. Ён прыглядаўся да іх і адчуваў такія ж цікаўныя позіркі на сабе. «А што ты за хлапец?» — нібы пыталі яны. Яму захацелася адразу адказаць, і, следуючы гэтаму ўладарнаму жаданню, ён напрасіў слова і ціха, але чотка сказаў:

— Заўтра я, таварышы, ваяваць пачынаю: раблю першы баявы вылет. Даю вам слова камуніста, што буду змагацца сумленна, скардзіцца на мяне не будзеце.

Ён змоўк, адчуўшы на сабе крыху здзіўленыя позіркі. І толькі адзін чалавек глядзеў на яго пахвальна, усміхаючыся, — камандзір часці, і ў яго позірку Камінскі прачытаў: «Малайчына!». Ён адразумеў, што падпалкоўнік верыць яму. І на сэрцы ў Камінскага стала радасна, ён таксама ўсміхнуўся. Назаўтра раніцой Камінскі ўйшоў у першы баявы палёт.

Мінулі дні. Восень пажаўціла прасторнае поле аэрадрома. Стаялі нерухома ў небе чароды хмар. Іван Камінскі звыкся з трывожнай невядомасцю бою, палюбіў таварышаў пілотаў. Яму давялося пабываць у сур'ёзных пераплётах. Але стаў Камінскі яшчэ больш спакойным і ўпэўненым.

І вось пілоту давялося ляцець у Беларусь. Цэлы дзень хадзіў ён нейкі незвычайны, маўклівы. Члены экіпажу трывожна пераглядаліся: з чаго б гэта? А ён думаў горкую, цяжкую думу. Ён ведаў, што з наступленнем цемры павядзе свой карабель на Віцебск, каб правесці разведку і бамбіць склады і эшалоны немцаў. У думках бачыў ён знаёмыя абрысы любімага горада, і сэрца яго пачашчана білася.

— Заданне выканаў, — дакладваў Камінскі. — Бачу пяць ачагоў пажару. Вяртаюся. Адпомсціў фашыстам за родны Віцебск.

Па многіх трасах прайшоў самалёт Камінскага. Першым у палку Камінскі праклаў шлях на Кенігсберг. Тройчы разведваў і бамбіў яго экіпаж гэтае змяінае гняздо гітлераўцаў. Пяціканцовыя зоркі на крыллях карабля адважнага лётчыка бачылі водблескі пажараў Цільзіта і Варшавы, Эльбіта і Гдыні. Лётчык цвёрда памятае аб слове, якое даў на партыйным сходзе, і свята выконваў яго. Адной з веснавых начэй, калі Камінскі ішоў выконваць заданне ў раён Гомеля, пры пераходзе лініі фронта ён прыняў паведамленне падпалкоўніка Родзіна:

— Наш полк пераўтворан у гвардзейскі, віншую, таварыш гвардыі капітан.

— Дзякуй, таварыш гвардыі падпалкоўнік, апраўдаю высокае званне.

КАРОТКАЯ летняя ноч. Але мінуты яе на лётным полі цягнуцца незвычайна пакутліва. На камандным пункце гвардыі падпалкоўнік напружана сочыць за паветрам. Хутка павінны вяртацца экіпажы з задання. У гэтыя мінуты суровая рука трывогі ледзь улоўным узмахам высерабрыць не адзін водас. Але вось плаціна невядомасці прарвана. Першы радуючы сігнал: «Прайшоў лінію фронта». Адзін за другім даюць аб сабе ведаць вяртаючыяся экіпажы. Але штосьці не чуваць Камінскага. Што магло здарыцца? Нядаўна ж сувязь з ім была нармальная. Бягуць мінуты. Большасць самалётаў ужо зрабіла пасадку, а Камінскага ўсё няма. І раптам голас прапаўшага ўзнікае ў мікрафоне, і радасная ўсмешка шавяліць губы падпалкоўніка.

— На маршруце бачу дзеючы аэрадром праціўніка, — чуе Родзін. — Іду на яго.

Мінута надзвычай напружаная. Падпалкоўнік моцна ўпіраецца рукамі ў стол.

— Далажыце, што бачыце, — загадвае ён.

— Бачу самалёты праціўніка. Сувязь канчаю.

За сотні кіламетраў ад КП палка Іван Камінскі пільна ўглядаецца ў сіняву, спакойна сціскаючы ў руках штурвал самалёта. Варожыя бамбардзіроўшчыкі, відаць, вяртаюцца з задання, спяшаюцца сесці. Упэўненыя ў бяспецы, свабодна заходзяць на пасадку. Унізе бачыць Камінскі акуратна выкладзеныя пасадачныя знакі і рады самалётаў. Аэрадром гэты невядомы. «Вось дык адкрыццё!» — думае Камінскі. І ў яго раптоўна ўзнікае дзёрзкая думка. Нейкую дзесятую долю секунды ён сумняваецца, але затым рашуча камандуе:

—Сынкі, будзьце пільнымі, атакую, — і Камінскі, зніжаючыся на 500 метраў, уключаецца ў круг нямецкіх бамбардзіроўшчыкаў. «Зараз будзе ілюмінацыя, — гарэзліва думае Камінскі, — факельнае шэсце ў гонар звар'яцелага «фюрэра». Параўняўшыся з «Юнкерсам-88», ён загадвае:— Штурман, агонь!

Ахоплены полымем «Юнкерс-88», да найвялікшага здзіўлення гітлераўцаў, падае на лётнае поле. Унізе пад сабой Камінскі бачыць яшчэ 6 самалётаў і, знізіўшыся, абстрэльвае іх. На аэрадроме ўключаюць агні. Камінскі ў адно імгненне прыстрайваецца да другога «Юнкерса»:

— Агонь, стралок!

Краем вока бачыць Камінскі, як завіляў «Юнкерс». Не зразумеўшы ў чым справа, немец дае некалькі зялёных ракет, сігналізуючы, што, маўляў, свой. Камінскі ўсміхаецца: зразумела! І калі «Юнкерс» падае ўніз і ўспыхнуўшыя пражэктары асляпляюць Камінскага, ён камандуе:

— Штурман, зялёную ракету.

Унізе тухнуць пражэктары. «Цяпер убірайся, пакуль не позна», — рашае Камінскі. Набраўшы вышыню і пакінуўшы ззаду сябе варожы аэрадром, лётчык перадае на КП:

— На аэрадроме рабілі пасадку варожыя самалёты. Экіпажам збіты два самалёты праціўніка. Вяртаюся.

Уздых палёгкі вырываецца з грудзей падпалкоўніка.

УШТАБНУЮ зямлянку ўвайшоў высокі, ладна збіты лётчык. Гэта быў камандзір эскадрыллі капітан Камінскі. Ён толькі што вярнуўся з разведкі, і па твару яго было відаць, якога напружання запатрабаваў толькі што закончаны палёт.

— Ну, як там? — спыталі Камінскага таварышы.

— Здорава б'юць, — сур'ёзна адказаў капітан. — Я яшчэ ні разу не бачыў такога зяянітнага агню...

Узяўшы тэлефонную трубку, ён стаў дакладваць аб сваім палёце начальніку штаба палка. З кароткага даклада капітана вынікала, што цэль, якую трэба было сёння бамбіць, абаронена моцным зянітным агнём. Апрача таго, нізкая воблачнасць прымушае атакаваць з невялікай вышыні. Значыцца, палёт робіцца ў зоне абстрэлу не толькі зянітнай артылерыі, але і пяхотнай зброі. Самалёт капітана Камінскага атрымаў сур'ёзныя пашкоджанні. Было дзіўна, як здолеў лётчык давесці да аэрадрома машыну.

Капітан Камінскі спакойна дакладваў начальніку штаба, што, на яго думку, бамбіць варожыя пазіцыі можна, але толькі асобнымі парамі, а не вялікай групай самалётаў. Нізкая воблачнасць і вельмі абмежаваная бачнасць не дазваляюць нанесці масіраваны ўдар, як гэта планавалася раней. Камандаванне згадзілася з думкай капітана, і тут жа быў аддадзен загад на вылет асобных пар.

Пачалася падрыхтоўка да вылету. Капітан Камінскі знаходзіўся каля сваіх машын. Ён пачуў, як адзін малады лётчык, размаўляючы з таварышам, заўважыў мімаходам, што тактыка «паляўнічых» таксама наўрад ці зберажэ ад страт. Па гэтай фразе, сказанай нібы выпадкова, капітан зразумеў, што складаная абстаноўка маючага адбыцца палёту выклікае трывогу сярод некаторых мала абстраляных лётчыкаў. Яны ведалі, што іх не будуць прыкрываць знішчальнікі і што ім прыдзецца прабыць некалькі мінут у зоне шчыльнага зянітнага агню. Гэта і хвалявала людзей. Між тым поспех атакі залежаў, галоўным чынам, ад вытрымкі лётнага складу.

Капітан Камінскі, які добра разумеў усю складанасць маючых адбыцца дзеянняў, рашыў першым лячь на выкананне задання.

Гэта быў надзвычай цяжкі палёт. Яшчэ пералятаючы лінію фронта, лётчык быў ранены. Аднак, перамагаючы боль, ён працягваў палёт і лёг на адваротны курс толькі тады, калі цалкам выканаў задачу.

Гэта быў наглядны прыклад усім лётчыкам часці і асабліва маладым лётчыкам, якія ў першыя дні свайго знаходжання на фронце не заўсёды былі ўпэўнены ў сваіх сілах і здольнасцях, калі траплялі ў складаную баявую абстаноўку.

ЯНЫ УХОДЗЯЦЬ у палёт на хуткіх і верных машынах. Пад крыллямі іх самалётаў плывуць палі бітваў, лясы і рэкі, гарады і вёскі. У блакітным акіяне неба самалёт разведчыка нібы арол лунае над зямлёй. Але нішто не ўтоіцца ад пільнага вока! Вораг хітры. Ён ведае многа спосабаў, як аамаскіравацца. Але разведчык яшчэ больш хітры. Ён зробіць усё, каб прасачыць, знайсці ворага.

Гэтых разведчыкаў бласлаўлялі Кіеў і Мінск, Смаленск і Арол, Каунас і Рыга, Кішынёў і Львоў. Разведчая авіяцыя ў гады Айчыннай вайны выхавала многа праслаўленых герояў, аб якіх можна смела сказаць, што яны з'яўляліся вачыма арміі. Многія героі-разведчыкі сталі вядомымі ўсёй Радзіме, заслужылі сваімі подзвігамі славу і любоў.

Хіба можна без захаплення гаварыць аб тым, што гвардыі капітан Камінскі за 221 баявы вылет разведаў сотні аэрадромаў, чыгуначных станцый, сфатаграфаваў тысячы квадратных кіламетраў мясцовасці, знаходзячы на ёй тэхніку і жывую сілу ворага пры самых нечаканых акалічнасцях для ворага, пры самай хітрай яго маскіроўцы.

Дзесяткі разоў ён уступаў у няроўны бой з ворагам, збіў тры нямецкіх самалёты, чатыры разы падбівалі яго і аднойчы сеў на свой аэрадром на палаючым самалёце. Камінскі ўсімі сіламі імкнуўся выйсці цэлым і здаровым з бою, уцалець не толькі з пачуцця самазахавання, але кіруемы страсным жаданнем данесці да сваіх сабраныя каштоўныя звесткі.

Радзіма высока ацаніла подзвігі Камінскага — на яго грудзях зяюць сем баявых ордэнаў і залаты медаль Героя Савецкага Саюза.

ПЕРАД намі крыху пажоўклая фатаграфія маладога хлопца ў гімнасцёрцы. Просты адкрыты твар, прамы рашучы позірк. На пятліцах гімнасцёркі — эмблема ваеннага лётчыка. Знакаў адрозненя яшчэ няма—малады лётчык сфатаграфаваўся да прысвоення яму воінскага звання. Гэта—Камінскі Іван Ларыонавіч, сын беларускага селяніна з сяла Мягкія Машканскага сельсавета Багушэўскага раёна, што на Віцебшчыне. Нарадзіўся Камінскі ў 1919 годзе. Пасля заканчэння сямігодкі ў 1937 годзе паступіў у Віцебскі рабфак і адначасова вучыўся ў аэраклубе Асаавіяхіма, а ў 1939 годзе накіраван у трохгадовую лётную школу. Закончыў яе ў 1941 годзе і накіраван на перавучванне на новай матэрыяльнай частцы. 8 жніўня 1941 года прыбыў на фронт і ўступіў у рады папаўнення, як упаўне падрыхтаваны лётчык-бамбардзіроўшчык.

Велізарнае напружанне фізічных і маральных сіл, цяжкія раненні ў баях з ворагам пазбавілі Камінскага магчымасці працягваць лётную работу, і пасля перамаганоснага завяршэння вайны ён дэмабілізаваўся з радоў Савецкай Арміі, а цяпер вучыцца на другім курсе Вышэйшай партыйнай школы і адначасова працуе сакратаром Фрунзенскага райкома КП Беларусі.

А. КЛЯШЧОЎ,
палкоўнік у запасе.